УДК 398

**Т. А. Марозава** (Мінск)

# КЛАСІФІКАЦЫЯ І ЖАНРАВАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ СУЧАСНАГА СТУДЭНЦКАГА ФАЛЬКЛОРУ БЕЛАРУСІ

Студэнцкая культура і яе яскравае праяўленне – фальклорныя творы – адносяцца да адной з самых традыцыйных і ўстойлівых у сістэме сучаснай гарадской культуры. Як адзначыў рускі даследчык К. Э. Шумаў, «да асноўных фактараў,

якія ўплываюць на фарміраванне студэнцкага асяроддзя і, адпаведна, студэнцкіх традыцый, можна аднесці полаўзроставыя, сацыяльныя, прафесійныя, гістарычныя» [2, с. 165]. Спынімся на важнейшых з іх.

*Узроставыя* фактары вызначаюць адносную аднастайнасць асяроддзя, у якім сярэдняя розніца ва ўзросце ўнутры групы не перавышае аднаго-трох гадоў. Гэта адрознівае студэнцкае асяроддзе ад дзіцячай (у шырокім сэнсе, бо сюды ўваходзяць школьнікі ўсіх класаў) субкультуры, у межах якой фарміруецца сфера зносін у межах аднаго дакладнага ўзроставага года.

*Палавы* склад студэнцтва без уліку спецыяльнасці фарміруецца з перавагай жанчын, хаця ёсць установы вышэйшай адукацыі і спецыяльнасці, дзе дамінуюць мужчыны. Аднак, тым не менш, большая частка прааналізаваных намі тэкстаў была зафіксавана ад мужчын і адлюстроўвае «мужчынскі» погляд на свет. Названая акалічнасць у многім вызначае і спецыфіку жанраў, і лексіка-стылічныя асаблівасці фальклорных твораў. Сам жа факт запісаў твораў ад маладых людзей, відаць, можна патлумачыць адносна большай сацыяльнай актыўнасцю студэнтаў-мужчын, іх значнай адкрытасцю. Спецыялізацыя ўстаноў вышэйшай адукацыі і спецыфіка навучання пакідае яскравы адбітак на фарміраванні традыцый унутры студэнцкага асяроддзя. У сувязі з гэтым стэрэатыпныя ўяўленні аб спецыяльнасцях замацоўваюцца ў розных жанравых формах.

Апірышча на *гістарычныя* традыцыі – адна з асноўных рыс, якая ўплывае на развіццё ўяўленняў студэнтаў і аб студэнтах. Так, для студэнцкіх традыцый усіх часоў характэрна праслаўленне п’янства і свабоды нораваў, скасаванне канонаў, рэлігійнае і палітычнае адмаўленне. Менавіта такім чынам фарміруецца спецыфічны стэрэатып паводзінаў, сістэма персанажаў і асноўныя тэматычныя групы студэнцкага фальклору. Яшчэ адна характэрная для студэнцкіх фальклорных жанраў рыса – выкарыстанне розных сродкаў стварэння камічнага. Яна звязана, хутчэй за ўсё, з тым, што для маладзёжнага асяроддзя ўласціва непрыняцце і адмаўленне існуючых «чужых» традыцый (узроставых, грамадскіх і інш.). Як раз у гэтым і праяўляецца юнацкі максімалізм, уласцівы студэнцкай субкультуры ў цэлым.

Генезіс студэнцкага фальклору даследчыкі звязваюць з 70–80-мі гадамі XX стагоддзя, аднак як від творчасці аформіўся ён толькі ў 90-я гады, калі маладзёжная культура падзялілася на асобныя субкультурныя аб’яднанні. Студэнцкі фальклор – найбольш рухавы і інтэрнацыянальны (маюцца на ўвазе краіны былога СССР), таму што любое студэнцкае асяроддзе з ім знаёмае. Як правіла, у якасці мовы трансляцыі выкарыстоўваецца менавіта руская як мова, на якой доўгі час вялося (а ў некаторых краінах, у тым ліку і ў Беларусі, і зараз вядзецца) навучанне ў савецкіх рэспубліках.

Важнай асаблівасцю класіфікацыі фальклорных відаў і жанраў, якія функцыянуюць у студэнцкім асяроддзі, з’яўляецца тое, што яна, абапіраючыся на адзін крытэрый, выяўляе наступную заканамернасць: адны і тыя ж жанры, з рознай ступенню інтэнсіўнасці, прадстаўлены ў кожным з чатырох раздзелаў класіфікацыі, але пры гэтым праяўляюць кожны раз сэнсава адрозную функцыянальнасць, нягледзячы на фармальную аднастайнасць. Традыцыйная класіфікацыя, заснаваная на фармальна-сэнсавым крытэрыі, калі аб’ядноўваюцца ў адзін блок творы толькі канкрэтнай групы/жанру, тут не «спрацоўвае». Прычына – у спе-

цыфічнай функцыянальнасці, якая закладзена ў аснову прапаноўваемага крытэрыя класіфікацыі. У дадзеным выпадку гэты крытэрый – традыцыя, якая рэгулюе і фарміруе адносіны паміж «суб'ектам і аб'ектам» зносін. Адпаведна класіфікацыя фальклорных твораў студэнцкага асяроддзя ўключае ў сябе наступныя разнавіднасці:

1) жанры, якія рэгулююць і фарміруюць адносіны паміж «дасведчанымі» («суб'ектам») і «недасведчанымі» («іншымі суб'ектамі») ва ўласна студэнцкім асяроддзі: анекдоты, афарызмы, жарты, тосты, песні, «дражнілкі»;

2) жанры, якія рэгулююць і фарміруюць адносіны паміж студэнтамі («суб'ектамі») і выкладчыкамі («аб'ектамі»), у тым ліку падчас заняткаў і экзаменацыйных іспытаў: анекдоты, афарызмы, прыкметы, вусныя апавяданні, тосты;

3) жанры, якія рэгулююць і фарміруюць адносіны паміж студэнтамі («суб'ектамі») і «знешнім светам» («астатнімі аб'ектамі»), у тым ліку з іншымі сацыяльнымі і прафесійнымі групамі: анекдоты, розыгрышы, вусныя апавяданні.

Разгледзім найбольш актуалізаваныя фальклорныя жанры, якія бытуюць у асяроддзі сучаснага студэнцтва Беларусі. Усе творы былі ўзяты для аналізу з рэгіянальнага архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ.

**Прыкметы**

Аналіз фальклорнага матэрыялу студэнтаў паказаў, што ўсе прыкметы могуць быць аб'яднаны ў тры групы. Аднак аб'ядноўвае іх адно – забабонны характар: усе творы гэтага жанру, так ці інакш, звязаны з функцыяй абярэгу ад *нечага/некага*. Так, даволі вялікая колькасць прыкмет, якія бытуюць сярод студэнцкай моладзі, адносяцца да неспецыфічных, агульнавядомых, што сведчыць аб сувязі студэнцкага асяроддзя са «знешнім светам», ці грамадствам. Напрыклад:

*Если оказаться между людьми с одинаковыми именами, надо загадать желание и обязательно поменяться местом с одним из них или уйти из «середины»*;

*Если наступили на ногу, надо обязательно наступить «в ответ», иначе поссоришься с этим человеком*;

*Если упадет ложка, придет женщина. Если упадет нож, придет мужчина. Если упавший предмет сразу же вымыть, то никто не придет*;

*Если говорят о чем-то хорошем, нужно плюнуть три раза через левое плечо и постучать три раза по дереву*;

*Если, выйдя из дома, забыл что-то, нужно вернуться и взять это. Чтобы не было беды, перед выходом надо посмотреться в зеркало* [1].

Да другой групы можна аднесці прыкметы ўласна гарадскія, якія сваім узнікненнем абавязаны менавіта гарадскому побыту і прасторы. Напрыклад:

*«Счастливый» билет в транспорте (у которого сумма первых двух-трех цифр в номере совпадет с суммой последних двух-трех цифр) нужно съесть, загадав желание*;

*Нельзя наступать на швы между квадратными бетонными плитами – беда будет*;

*Насчитаешь сто машин одной определенной марки или цвета – загадай желание* [1].

Трэцюю групу складаюць уласна студэнцкія прыкметы, якія ўзнаўляюць у розных мадыфікацыях рысы студэнцкай субкультуры. Некаторыя з іх мадэлю-

юцца па традыцыйнай схеме, якая вядомая вясковай сялянскай культуры і заснавана на ўяўленнях ці аб магіі падабенства («*Чтобы успешно сдать экзамен, надо, чтобы родные или друзья во время экзамена держали палец в чернилах*» [1]), ці аб магіі дзеяння («*Перед тем как войти в аудиторию, нужно постучать трижды по левому косяку*»; «*Во время экзаменов нельзя стричь волосы и ногти*» [1]), ці аб магіі лічбаў («*Если билеты лежат в ряд, нужно отсчитать тринадцатый, тогда повезет*» [1]).

**Анекдоты**

Колькасны склад анекдотаў, якія бытуюць у студэнцкім асяроддзі, велізарны. Таму пры іх аналізе больш прадуктыўна весці гаворку аб спецыфічнай студэнцкай тэматыцы, якая складае стрыжань гэтага жанру. Вобразнасць студэнцкіх анекдотаў стэрэатыпная. Яна фіксуе ўяўленні аб студэнцкім жыцці з некалькіх бакоў. Гэта:

- побыт – стэрэатыпнасць праяўляецца тут пры стварэнні вобраза студэнта праз яго ўзаемаадносіны з выкладчыкам, са студэнтамі малодшых і старэйшых курсаў, з жонкай/мужам-студэнтам, з «іншымі суб'ектамі» і «знешнім светам». Вынік функцыянавання анекдота гэтай групы – студэнт галодны[1], бедны, знаходлівы, пахабны, сексуальны. Напрыклад:

*В метро едет бабка, смотрит – худой студент. Она ему место уступает: «Мальчик, садись». – «Да нет, бабушка, спасибо». – «Садись, мальчик, ты такой худенький». – «Да нет, спасибо, я постою». – «Ты, неверное, отличник?». – «Нет, бабушка, я троечник». – «Ну, давай я хоть твой плащ подержу». – «Это не плащ, бабушка, это мой однокурсник, вот он отличник»* [1];

*Жена говорит мужу-студенту: «Я уже не знаю, как штопать твои носки. Дырка на дырке». Муж ей советует: «А ты к туфлям пришей»* [1];

- апазіцыя «студэнт – выкладчык». Як паказаў аналіз, сярод такіх анекдотаў сустракаюцца ў большасці пераробкі, «прыстасаваныя» да канкрэтных устаноў вышэйшай адукацыі, факультэтаў, «вядомых» выкладчыкаў. Напрыклад:

*Умер преподаватель. Студент встречает однокурсников после кладбища, а те все в земле перемазались. «Вы чего такие грязные?» – «Да на "бис" хоронили»* [1];

- сесія, экзамен – экстрэмальная сітуацыя. Вобразнасць у энекдотах дадзенай групы наступная: студэнт – знаходлівы, хаця вучыцца дрэнна, ці ведае шмат, але яго недалюблівае выкладчык; выкладчык – нездагадлівы, неаб'ектыўны, часта «пасуе» ў «паядынку» са студэнтам. Напрыклад:

*Как ставят оценки на экзаменах: пять – если знаешь преподавателя, четыре – если знаешь, как выглядит учебник, три – если знаешь, какой предмет сдаешь*;

*Профессор спрашивает студентку: «Можете ли вы доказать, что вода притягивает электричество?» – «Конечно. Каждый раз, когда я залезаю в ванную, звонит телефон»*;

*У преподавателя было два студента: один любимчик, второй – наоборот. Приходит любимчик на экзамен, вытягивает вопрос «Сколько человек погибло*

---

[1] Трэба адзначыць, што ў творах, зафіксаваных напачатку 2000-х гадоў, гэтая рыса ўжо не сустракаецца, што звязана, відаць, з паляпшэннем умоў жыцця студэнтаў. Тым не менш названая акалічнасць патрабуе свайго далейшага вывучэння.

*во время Великой Отечественной войны". Отвечает, что 20 миллионов, получает «отлично» и уходит. Нелюбимый студент вытягивает тот же вопрос, отвечает, что 20 миллионов. Преподаватель: «Перечислить поименно»* [1];

*Экзамен на 2 курсе*

*Все сдувают со шпор... Препод оборачивается – все сдувают со шпор. Препод кашляет – все делают вид, что не сдувают со шпор.*

*Экзамен на 5 курсе*

*Все сдувают со шпор... Препод оборачивается – все сдувают со шпор. Студент кашляет, препод поворачивается спиной к аудитории* [1];

• узаемаадносіны з іншымі факультэтамі і спецыяльнасцямі – тэматыка, якая транслюе негатыўнае стаўленне да «іншых суб'ектаў». У якасці стваральніка карціны высмейвання выступаюць розныя сродкі камічнага – гумар, гратэск, часам іронія, цікавыя супастаўленні, інтэлектуальныя алюзіі. Напрыклад:

*Идут три студента: двое умных, а третий из политеха;*

*Что такое математика? Это когда в темной комнате ищут черного кота. Что такое физика? Это когда в темной комнате, заставленной шкафами, ищут черного кота. Что такое философия? Это когда в темной комнате ищут черного кота, которого там нет. Что такое научный коммунизм? Это когда в темной комнате ищут черного кота, котрого там нет, но все кричат: «Поймал!»* [1].

**Вусныя апавяданні**

Да экзаменацыйных анекдотаў і прыкмет, анекдотаў аб узаемаадносінах паміж выкладчыкам і студэнтам далучаюцца і вусныя апавяданні аб нетрадыцыйных сітуацыях на экзамене. Часам адбываецца наступная трансфармацыя: падобныя нестандартныя сітуацыі кладуцца ў аснову анекдота, у сувязі з чым складана вызначыць, што было першапачатковым – вусная гісторыя ці анекдот. Адзінае адрозненне тут – аб'ём апавядаемай інфармацыі, хаця і гэты крытэрый досыць умоўны: вядомы анекдоты, якія смела можна было б лічыць апавяданнем. У дадзеным выпадку дасканалая, строгая дыферэнцыяцыя з вызначэннем жанру неабавязковая. Гэта яшчэ раз даказвае той факт, што фальклор значна больш багацейшы, чым тая сістэма тэрмінаў і паняццяў, у якую навукоўцы спрабуюць яго «апрануць».

**Афарызмы**

Іх можна назваць самымі «традыцыйнымі» сярод студэнцкіх фальклорных жанраў. У нечым яны падобныя на прыказкі і прымаўкі, але валодаюць спецыфічнай змястоўнасцю, якая, уступаючы ў сінтэз са спецыфічнай «падачай» зместу, набывае новы мастацкі эфект. Напрыклад:

*От старения нации нас может спасти только смертность старого населения*;

*Уроки затормаживают развитие и убивают способность к индивидуальному мышлению*;

*Перед экзаменом не хватает одного дня*;

*Огромное преимущество экзаменатора в том, что он сидит по лучшую сторону стола*;

*Он досрочно завалил экзамены*;

*Сегодня физик – завтра защитник Родины* [1].

Такім чынам, прыклады студэнцкага фальклору сведчыць аб тым, што студэнцкая моладзь Беларусі з'яўляецца носьбітам спецыфічнай фальклорнай спад-

чыны, засвойваючы дасягненні мінулага і ствараючы наватворы, у змястоўным і жанравым плане разнастайныя. Як і кожная з’ява культуры, такія творы патрабуюць свайго далейшага дэталёвага вывучэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Матэрыялы рэгіянальнага архіва Мінскай вобласці Фонда фальклорных матэрыялаў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору філалагічнага факультэта БДУ.

2. *Шумов, К. Э.* Студенческие традиции // Современный городской фольклор : сб. науч. тр. / отв. ред. С. Ю. Неклюдов. – М., 2003. – С. 103–122.